ISSN 0868—8621

# ВЕДАМАСЦІ

## ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

№ 10(12)

1991 год

ВЫДАННЕ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

МІНСК

# ВЕДАМАСЦІ

## ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

**5 красавіка 1991 г.** **№ 10(12)** **Выдаюцца з 1990 г.**


## ЗМЕСТ


111. Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

112. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Беларускай ССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

113. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб Комплекснай мэтавай праграме Беларускай ССР «Ахова мацярынства і дзяцінства ва ўмовах уздзеяння вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» на 1991—1995 гады.

114. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб перадачы некаторых паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Беларускай ССР у сферы рэгулявання зямельных адносін Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

115. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб правядзенні зямельнай рэформы ў рэспубліцы.

116. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб частковым змяненні структуры Савета Міністраў Беларускай ССР.

117. Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Беларускай ССР «Аб Савеце Міністраў Беларускай ССР».

118. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб вызваленні тав. Ціхіні В. Г. ад пасады Міністра юстыцыі Беларускай ССР.

119. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб назначэнні Міністра юстыцыі Беларускай ССР.

120. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб назначэнні Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларускай ССР.

121. Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб назначэнні Міністра будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог Беларускай ССР.

ЗАКОН
БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

## 111 Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС*

Аварыя, якая адбылася 26 красавіка 1986 года на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, з'яўляецца самай буйной катастрофай сучаснасці. Яна закранула лёс мільёнаў людзей, якія пражываюць на велізарных тэрыторыях. Стварыліся новыя экалагічныя, сацыяльныя і эканамічныя ўмовы ў рэгіёнах радыеактыўнага забруджання.

Беларусь аб'яўлена зонай нацыянальнага экалагічнага бедства. Да гэтага часу немагчыма ацаніць увесь аб'ём і вынікі чарнобыльскай катастрофы. Прадухіленне неспрыяльнай сацыяльнай і экалагічнай сітуацыі ў рэспубліцы патрабуе значных намаганняў, прыцягнення вялікіх фінансавых, матэрыяльных і навуковых рэсурсаў рэспублікі і краіны.

### Раздзел I
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1.** Гэты Закон накіраваны на абарону правоў і інтарэсаў грамадзян, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, былі адселены і выехалі на новае месца жыхарства з тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, пражываюць на ўказанай тэрыторыі, і іншых катэгорый грамадзян, вызначаных гэтым Законам.

**Артыкул 2.** Грамадзяне, якія пражываюць (працуюць) на тэрыторыі Беларускай ССР, маюць права на атрыманне льгот і кампенсацый за ўрон, прычынены іх здароўю і маёмасці ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, у парадку і на ўмовах, устаноўленых гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Беларускай ССР і Саюза ССР.

**Артыкул 3.** Умовы пражывання і працоўнай дзейнасці насельніцтва без абмежаванняў па радыяцыйнаму фактару на

---

* *Апублікаваны ў газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Белорусская нива» 13 сакавіка 1991 года.*

забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі вызначаны саюзнай канцэпцыяй пражывання насельніцтва ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, адобранай 6 снежня 1990 года Каардынацыйным саветам па навуковых праблемах, звязаных з экалагічнымі вынікамі выкарыстання новых тэхналагічных сістэм, пры Прэзідыуме Акадэміі навук СССР і рэспубліканскай канцэпцыяй, адобранай 19 снежня 1990 года Бюро Прэзідыума Акадэміі навук Беларускай ССР.

Асноўным паказчыкам ацэнкі тэрыторыі, дзе ўмовы пражывання і працоўная дзейнасць насельніцтва не патрабуюць якіх-небудзь абмежаванняў, устаноўлена эквівалентная доза апраменьвання насельніцтва, што пражывае на ёй, якая не павінна перавышаць 1 мЗв (0,1 бэр) у год. Пры перавышэнні эквівалентнай дозы апраменьвання 1 мЗв (0,1 бэр) у год над узроўнем натуральнага і тэхнагеннага радыяцыйнага фону праводзяцца ахоўныя мерапрыемствы, у тым ліку і адсяленне, чарговасць і этапы якога ўстанаўліваюцца Беларускай нацыянальнай камісіяй па радыяцыйнай ахове насельніцтва.

**Артыкул 4.** Тэрыторыя радыеактыўнага забруджання — гэта тая частка тэрыторыі Беларускай ССР, на якой ёсць стойкае забруджанне навакольнага асяроддзя радыеактыўнымі рэчывамі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і дзе патрабуецца правядзенне спецыяльных ахоўных мер (шчыльнасць забруджання глеб радыенуклідамі цэзію-137 або стронцыю-90 ці плутонію адпаведна 1,0; 0,15; 0,01 Кі/кв. км і больш).

Уся тэрыторыя па шчыльнасці забруджання падзяляецца на зоны:

1) зона эвакуацыі — тэрыторыя вакол Чарнобыльскай АЭС, з якой у 1986 годзе ў адпаведнасці з існаваўшымі нормамі радыяцыйнай бяспекі было эвакуіравана насельніцтва (30-кіламетровая зона і тэрыторыя, з якой праведзена дадатковае адсяленне ў сувязі з забруджаннем тэрыторыі стронцыем-90 звыш 3 Кі/кв. км і плутоніем — 0,1 Кі/кв. км);

2) зона першачарговага адсялення — тэрыторыя са шчыльнасцю забруджання глеб цэзіем-137 ад 40 Кі/кв. км або адпаведна стронцыем-90 ці плутоніем ад 3,0; 0,1 Кі/кв. км і больш;

3) зона далейшага адсялення — тэрыторыя са шчыльнасцю забруджання глеб цэзіем-137 ад 15 да 40 Кі/кв. км або стронцыем-90 ад 2 да 3 Кі/кв. км ці плутоніем ад 0,05 да 0,1 Кі/кв. км, дзе доза апраменьвання чалавека можа перавысіць 5 мЗв (0,5 бэр) у год;

4) зона з правам на адсяленне — тэрыторыя са шчыльнасцю забруджання глеб цэзіем-137 ад 5 да 15 Кі/кв. км або стронцыем-90 ад 0,5 да 2 Кі/кв. км ці плутоніем ад 0,01 да 0,05 Кі/кв. км, дзе доза апраменьвання насельніцтва перавышае дапушчальную мяжу 1 мЗв (0,1 бэр) у год;

5) зона пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем — тэрыторыя са шчыльнасцю забруджання глеб цэзіем-137 ад 1 да 5 Кі/кв. км, дзе доза апраменьвання насельніцтва не перавышае дапушчальнай мяжы 1 мЗв (0,1 бэр) у год.

Населеныя пункты, у якіх доза апраменьвання насельніцтва перавышае 1 мЗв (0,1 бэр) у год, у залежнасці ад велічыні дозавай нагрузкі могуць быць аднесены да зоны далейшага адсялення або да зоны з правам на адсяленне.

**Артыкул 5.** Аднясенне тэрыторыі да вышэйназваных зон ажыццяўляецца Саветам Міністраў Беларускай ССР на падставе даных па шчыльнасці забруджання глеб радыенуклідамі, зацверджаных Беларускім рэспубліканскім упраўленнем па гідраметэаралогіі.

**Артыкул 6.** Уезд у зону першачарговага адсялення і зону далейшага адсялення для пражывання без дазволу органаў аховы здароўя і мясцовых Саветаў народных дэпутатаў забараняецца.

**Артыкул 7.** Рээвакуацыя насельніцтва праводзіцца выключна ў добраахвотным парадку пасля зніжэння радыеактыўнага забруджання да ўзроўню, які забяспечвае ўмовы жыцця без абмежаванняў. Рашэнне аб рээвакуацыі насельніцтва прымаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР па заключэнню Беларускай нацыянальнай камісіі па радыяцыйнай ахове насельніцтва.

**Артыкул 8.** Прадукты харчавання, у якіх утрыманне радыенуклідаў не перавышае норм, устаноўленых Беларускай нацыянальнай камісіяй па радыяцыйнай ахове насельніцтва, а таксама міжнародных норм, прызнаюцца прыгоднымі да рэалізацыі і спажывання (у далейшым называюцца «чыстыя прадукты харчавання»).

**Артыкул 9.** Прадукты харчавання і сыравіна для іх, выробленыя на тэрыторыі Беларускай ССР, павінны мець сертыфікат (маркіроўку) з указаннем месца іх вытворчасці, утрымання радыенуклідаў.

**Артыкул 10.** Забараняецца вытворчасць і рэалізацыя любых відаў прадукцыі, утрыманне радыенуклідаў у якой перавышае нормы, устаноўленыя Беларускай нацыянальнай камісіяй па радыяцыйнай ахове насельніцтва, і міжнародныя нормы.

Забруджаная радыенуклідамі прадукцыя, якая паступіла на прадпрыемствы або для рэалізацыі ў гандлёвую сетку, падлягае адабранню і знішчэнню ва ўстаноўленым парадку.

**Артыкул 11.** Грамадзяне Беларускай ССР маюць права на атрыманне поўнай, своечасовай і дакладнай інфармацыі аб узроўнях забруджання тэрыторыі радыеактыўнымі рэчывамі, аб ступені забруджанасці радыенуклідамі прадуктаў харчавання і іншых тавараў народнага спажывання, аб патрабаваннях рэжыму радыяцыйнай бяспекі.

## Раздзел II
## СТАТУС ГРАМАДЗЯН, ПАЦЯРПЕЎШЫХ АД КАТАСТРОФЫ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС

**Артыкул 12.** Да грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, на якіх распаўсюджваецца дзеянне гэтага Закона, адносяцца як удзельнікі ліквідацыі вынікаў дадзенай катастрофы, так і насельніцтва, якое пацярпела ад яе.

**Артыкул 13.** Удзельнікамі ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС з'яўляюцца грамадзяне:

1) якія прымалі ў 1986—1987 гадах удзел у работах па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у межах зоны эвакуацыі або занятыя ў гэты перыяд на эксплуатацыі ці іншых работах на ўказанай станцыі (у тым ліку часова накіраваныя або камандзіраваныя), уключаючы ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных, прызваных на спецыяльныя зборы і прыцягнутых да выканання работ, звязаных з ліквідацыяй вынікаў дадзенай катастрофы;

2) якія прымалі ў 1988 годзе ўдзел у работах па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у межах зоны эвакуацыі або занятыя ў гэты перыяд на эксплуатацыі ці іншых работах на ўказанай станцыі (у тым ліку часова накіраваныя або камандзіраваныя), уключаючы ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных, прызваных на спецыяльныя зборы і прыцягнутых да выканання работ, звязаных з ліквідацыяй вынікаў дадзенай катастрофы;

3) якія прымалі ў 1986—1987 гадах удзел у работах па дэзактывацыі, будаўніцтву, па жыццезабеспячэнню насельніцтва ў зонах першачарговага адсялення і далейшага адсялення, уключаючы ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных, прызваных на спецыяльныя зборы і прыцягнутых да выканання гэтых работ.

Да ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных, указаных у пунктах 1—3 гэтага артыкула, адносяцца асобы афіцэрскага саставу, прапаршчыкі, мічманы, ваеннаслужачыя звыштэрміновай службы, сяржанцкі і радавы састаў, які знаходзіцца на абавязковай тэрміновай ваеннай службе ва Узброеных Сілах СССР, войсках Камітэта дзяржаўнай бяспекі, унутраных войсках, чыгуначных войсках і іншых воінскіх фарміраваннях, а таксама асобы начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

**Артыкул 14.** Да насельніцтва, пацярпеўшага ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, адносяцца грамадзяне, якія пражываюць (пражывалі) або працуюць (працавалі) на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, у тым ліку асобы, указаныя ў частцы другой артыкула 13 гэтага Закона, калі яны не аднесены да іншых катэгорый, вызначаных гэтым Законам.

**Артыкул 15.** Да грамадзян, на якіх распаўсюджваецца дзеянне гэтага Закона, адносяцца:

1) удзельнікі ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і асобы, указаныя ў артыкуле 14 гэтага Закона, якія сталі інвалідамі ў выніку гэтай катастрофы;

2) удзельнікі ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, вызначаныя артыкулам 13 гэтага Закона;

3) эвакуіраваныя з зоны эвакуацыі, а таксама самастойна пакінуўшыя гэту зону пасля катастрофы;

4) якія пражываюць або працуюць у зоне першачарговага адсялення, а таксама адселеныя або тыя, хто самастойна выехаў з гэтай зоны пасля катастрофы;

5) якія пражываюць або працуюць у зоне далейшага адсялення, а таксама адселеныя або тыя, хто самастойна выехаў з гэтай зоны пасля катастрофы;

6) якія пражываюць або працуюць у зоне з правам на адсяленне;

7) якія пражываюць або працуюць у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем;

8) дзеці, бацькі якіх (або адзін з іх) адносяцца (адносіцца) да катэгорыі асоб, указаных у пунктах 1—6 гэтага артыкула.

**Артыкул 16.** Дзеянне гэтага Закона распаўсюджваецца таксама на грамадзян Беларускай ССР, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі або пацярпелі ад аварый і іх вынікаў на іншых атамных аб'ектах грамадзянскага або ваеннага назначэння, а таксама пацярпелі ад гэтых аварый ці ў выніку выпрабаванняў, вучэнняў і іншых работ, звязаных з любымі відамі ядзерных установак, уключаючы ядзерную зброю.

**Артыкул 17.** Звароты па пытаннях аб аднясенні асобных грамадзян да той або іншай катэгорыі пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС вырашаюцца Дзяржаўным камітэтам Беларускай ССР па праблемах вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

## Раздзел III

## ІЛЬГОТЫ ЎДЗЕЛЬНІКАМ ЛІКВІДАЦЫІ ВЫНІКАЎ КАТАСТРОФЫ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС І ПРЫРАЎНАВАНЫМ ДА ІХ АСОБАМ

**Артыкул 18.** Асобы, якія прымалі ў 1986—1987 гадах удзел у работах па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у межах 10-кіламетровай зоны (у тым ліку часова накіраваныя або камандзіраваныя), уключаючы ваеннаслужачых і ваеннаабавязаных, указаных у частцы другой артыкула 13 гэтага Закона, прызваных на спецыяльныя зборы і прыцягнутых да выканання работ, звязаных з ліквідацыяй вынікаў указанай

катастрофы, эвакуіраваныя з 10-кіламетровай зоны, страціўшыя па заключэнню ўрачэбна-працоўнай экспертнай камісіі поўнасцю або часткова працаздольнасць, маюць права на:

1) бясплатнае атрыманне лякарстваў па рэцэптах урачоў;

бясплатнае забеспячэнне штогод санаторна-курортным лячэннем;

бясплатны праезд на транспарце (акрамя таксі) ад месца жыхарства да месца лячэння, дыспансернага, амбулаторнага або клінічнага абследавання і назад;

2) карыстанне пры выхадзе на пенсію медыцынскімі ўстановамі, да якіх яны былі прымацаваны ў перыяд работы;

3) кампенсацыю органамі сацыяльнага забеспячэння расходаў, звязаных з абслугоўваннем дома хворага, які па медыцынскаму заключэнню мае патрэбу ў пабочным доглядзе пры адсутнасці сваякоў, што пражываюць з ім;

4) выплату дапамогі па часовай непрацаздольнасці ў размеры 100 працэнтаў заработнай платы незалежна ад бесперапыннага працоўнага стажу;

5) выплату працуючым інвалідам дапамогі па часовай непрацаздольнасці да 4 месяцаў запар або 5 месяцаў у каляндарным годзе;

6) забеспячэнне прадуктамі харчавання па медыцынскіх нормах;

7) уладкаванне без чаргі ва ўстановы сацыяльнага забеспячэння;

8) пазачарговае абслугоўванне ў лячэбна-прафілактычных установах і аптэках;

9) атрыманне бальнічнага лістка (працуючым) на час лячэння ў санаторыі, куды ён накіраваны са стацыянарнай лячэбнай установы, з улікам часу праезду туды і назад;

10) пазачарговае забеспячэнне дзяцей месцамі ў дзіцячых дашкольных установах, незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці, спецыялізаваных дзіцячых установах лячэбнага і санаторнага тыпу, піянерскіх і іншых аздараўленчых лагерах;

11) бясплатнае ўтрыманне дзяцей у дзіцячых дашкольных установах (для незабяспечаных месцамі выплачваецца кампенсацыя кошту харчавання), піянерскіх лагерах;

12) выкарыстанне штогадовага водпуску ў зручны для іх час, а таксама атрыманне дадатковага водпуску без захавання заработнай платы тэрмінам да двух тыдняў у год;

13) пераважнае пакіданне на рабоце пры скарачэнні штату або колькасці работнікаў і працаўладкаванне пры рэарганізацыі або ліквідацыі прадпрыемства, установы, арганізацыі. Пры адсут-

насці ўмоў для прадаўжэння працоўнай дзейнасці гэтых асоб на тым жа прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі адміністрацыя абавязана аказаць ім дапамогу ў працоўным уладкаванні на іншае прадпрыемства, ва ўстанову, арганізацыю;

14) пазачарговае забеспячэнне жылой плошчай (па асобнаму спісу) тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на працягу года з дня ўстанаўлення інваліднасці;

15) аплату жылой плошчы (у межах норм, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам), займаемай гэтымі грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія пражываюць сумесна з імі, а таксама сем'ямі, што атрымліваюць пенсіі з выпадку страты карміцеля ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, у размеры 50 працэнтаў кватэрнай платы, вылічанай па стаўках, устаноўленых для рабочых і служачых. Указаным грамадзянам, а таксама сем'ям, якія атрымліваюць пенсіі з выпадку страты карміцеля ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, прадастаўляецца скідка ў размеры 50 працэнтаў з устаноўленай платы за карыстанне ацяпленнем, водаправодам, газам і электраэнергіяй, а тым, хто пражывае ў дамах, што не маюць цэнтральнага ацяплення, прадастаўляецца 50-працэнтная скідка з кошту паліва, якое набываецца ў межах норм, устаноўленых для продажу насельніцтву;

16) перадачу бязвыплатна ў прыватную ўласнасць займаемых імі кватэр у дамах дзяржаўнага жыллёвага фонду;

17) першачарговае прадастаўленне зямельнага ўчастка і набыццё матэрыялаў для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва;

18) першачарговае ўступленне ў жыллёвыя або жыллёва-будаўнічыя кааператывы, кааператывы па будаўніцтву і эксплуатацыі калектыўных гаражоў-стаянак для транспартных сродкаў і іх тэхнічнага абслугоўвання, садаводчыя таварыствы;

першачарговае набыццё садовых домікаў або матэрыялаў для іх будаўніцтва, прамысловых тавараў павышанага попыту, у тым ліку легкавых аўтамабіляў, матацыклаў і маторных лодак;

першачарговае абслугоўванне на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях сувязі, службы быту, грамадскага харчавання, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, тэхнічнага абслугоўвання і рамонту транспартных сродкаў і міжгародняга транспарту;

19) атрыманне беспрацэнтнай пазыкі на набыццё або будаўніцтва садовых домікаў і на добраўпарадкаванне садовых участкаў. Кампенсацыя банкам страт ад прадастаўлення ўказаных у гэтым пункце пазык ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту;

20) атрыманне беспрацэнтнай пазыкі на будаўніцтва або набыццё індывідуальных жылых дамоў з надворнымі пабудовамі ў размеры да 20 тысяч рублёў з пагашэннем 50 працэнтаў размеру пазыкі на працягу 25 гадоў пачынаючы з трэцяга года пасля яе атрымання. Кампенсацыя банкам страт ад прадастаўлення ўказа-

ных у гэтым пункце пазык ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту;

21) першачарговае бясплатнае выдзяленне аўтамабіля тыпу ЗАЗ-968 пры наяўнасці адпаведных медыцынскіх паказанняў. Па жаданню інваліда яму можа быць без чаргі прададзены аўтамабіль іншай маркі, за вылікам кошту тыпу аўтамабіля, які яму павінен належаць;

22) бясплатны праезд на гарадскім грамадскім транспарце (акрамя таксі), чыгуначным, аўтамабільным і водным транспарце прыгарадных зносін;

бясплатны праезд адзін раз у год у любы пункт краіны і назад на чыгуначным транспарце, а ў раёнах, якія не маюць чыгуначных зносін,— на водным, паветраным або аўтамабільным міжгароднім транспарце;

23) пазачарговую ўстаноўку тэлефона;

24) вызваленне ад выплаты падаходнага падатку, падатку на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных грамадзян. Ад падатку на маласямейных грамадзян таксама вызваляюцца жонка (муж) пацярпеўшага (пацярпеўшай) ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

25) паступленне па-за конкурсам у вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы і на курсы для прафесіянальнага навучання з прадастаўленнем ва ўсіх выпадках інтэрната на час вучобы. Асобы, якія закончылі навучальныя ўстановы на выдатна (з выдатнымі адзнакамі), прымаюцца ў далейшым у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы без экзаменаў па выніках гутаркі.

Ільготы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, распаўсюджваюцца на асоб, указаных у артыкулах 15, 16 і 21 гэтага Закона, у адносінах да якіх пацверджана прычынная сувязь страты працаздольнасці з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС (на іншых аб'ектах, звязаных з крыніцамі іанізіруючага выпраменьвання).

Ільготы, прадугледжаныя пунктамі 10, 14—20, 23 і 24 часткі першай гэтага артыкула, распаўсюджваюцца на членаў сям'і загінуўшага або памёршага, якія пражывалі разам з ім. У выпадку смерці асобы, указанай у частцы першай гэтага артыкула, членам яе сям'і або асобам, якія ўзялі на сябе расходы па правядзенню пахавання, выплачваецца дапамога на пахаванне ў размеры сямікратнай мінімальнай заработнай платы, устаноўленай у рэспубліцы.

**Артыкул 19.** Асобы, указаныя ў пункце 1 часткі першай артыкула 13 гэтага Закона, якія прымалі ў 1986—1987 гадах удзел у работах па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, маюць права на:

1) 50-працэнтную скідку з кошту набываемых па рэцэптах урачоў лякарстваў;

2) першачарговае штогадовае забеспячэнне па месцы работы бясплатнымі пуцёўкамі для аздараўлення ў санаторыях і дамах адпачынку;

3) пазачарговае забеспячэнне дзяцей месцамі ў дзіцячых дашкольных установах незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці;

4) першачарговае забеспячэнне жылой плошчай тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў;

5) атрыманне беспрацэнтнай пазыкі на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Кампенсацыя банкам страт ад прадастаўлення ўказаных у гэтым пункце пазык ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту;

6) вызваленне ад выплаты падатку на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных грамадзян. Ад падатку на маласямейных грамадзян таксама вызваляецца жонка (муж) пацерпеўшага (пацярпеўшай) ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

7) 50-працэнтную скідку з падаходнага падатку;

8) бясплатны праезд на гарадскім грамадскім транспарце (акрамя таксі), чыгуначным, аўтамабільным і водным транспарце прыгарадных зносін;

9) прадастаўленне 50-працэнтнай скідкі з кошту праезду адзін раз у год у любы пункт краіны і назад на чыгуначным транспарце, а ў раёнах, якія не маюць чыгуначных зносін,— на водным, паветраным або аўтамабільным міжгароднім транспарце;

10) першачарговую ўстаноўку тэлефона;

11) пераважнае (пры іншых роўных умовах) паступленне ў вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, прафесіянальна-тэхнічныя вучылішчы, на курсы для прафесіянальнага навучання з прадастаўленнем ва ўсіх выпадках інтэрната на час навучання. Прыём на падрыхтоўчыя аддзяленні пры адпаведных вышэйшых навучальных установах праводзіцца незалежна ад наяўнасці месцаў з абавязковым прадастаўленнем інтэрната;

12) выплату пры пераводзе ў адпаведнасці з медыцынскім заключэннем на ніжэйаплачваемую работу розніцы паміж ранейшым заработкам і заработкам на новай рабоце. Гэта розніца выплачваецца да аднаўлення працаздольнасці або ўстанаўлення інваліднасці.

Распаўсюдзіць на грамадзян, указаных у дадзеным артыкуле, ільготы, прадугледжаныя пунктамі 2, 4, 6, 8, 9, 12, 13, 17—19 часткі першай артыкула 18 гэтага Закона.

**Артыкул 20.** Асобы, указаныя ў пунктах 2 і 3 часткі першай артыкула 13 гэтага Закона, маюць права на:

1) першачарговае забеспячэнне пуцёўкамі для санаторна-курортнага лячэння і адпачынку;

2) выкарыстанне чарговага штогадовага водпуску ў зручны для іх час;

3) першачарговае ўступленне ў жыллёвыя або жыллёва-будаўнічыя кааператывы (у горадзе Мінску і абласных цэнтрах — пры наяўнасці прапіскі), у гаражна-будаўнічыя кааператывы і садаводчыя таварыствы.

Распаўсюдзіць на грамадзян, указаных у дадзеным артыкуле, ільготы, прадугледжаныя пунктамі 2, 4, 6, 8, 13 і 17 часткі першай артыкула 18 і пунктамі 3, 5, 11 і 12 часткі першай артыкула 19 гэтага Закона.

**Артыкул 21.** Асобы, якія працуюць у зоне эвакуацыі (у тым ліку часова накіраваныя або камандзіраваныя), маюць права на:

1) скарочаны рабочы дзень;

2) штогадовы аплачваемы водпуск у парадку, устаноўленым пунктам 12 часткі першай артыкула 23, за фактычна адпрацаваныя каляндарныя дні;

3) сутачныя ў павышаных размерах для часова накіраваных або камандзіраваных;

4) захаванне на працягу аднаго года сярэдняй заработнай платы пры пераводзе па медыцынскіх паказаннях з зоны эвакуацыі і на ніжэйаплачваемую работу або накіраванні на навучанне іншым прафесіям.

Канкрэтныя ўмовы рэжыму працы і адпачынку, аплаты працы і размеры матэрыяльных і сацыяльных ільгот у зоне эвакуацыі ўстанаўліваюцца ўрадамі Беларускай ССР і Саюза ССР.

Асобы, якія працавалі ў 1989 і наступных гадах у зоне эвакуацыі, маюць права на льготы, устаноўленыя пунктамі 2, 13 і 17 часткі першай артыкула 18, пунктам 5 часткі першай артыкула 19 гэтага Закона.

Ільготы, устаноўленыя дадзеным артыкулам, распаўсюджваюцца на асоб, указаных у частцы другой артыкула 13 гэтага Закона.

## Раздзел IV
## ІЛЬГОТЫ НАСЕЛЬНІЦТВУ, ЯКОЕ ПАЦЯРПЕЛА АД КАТАСТРОФЫ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС

**Артыкул 22.** Грамадзяне, эвакуіраваныя і адселеныя з зон эвакуацыі, першачарговага адсялення і далейшага адсялення, а таксама тыя, хто самастойна пакінуў гэтыя зоны пасля аварыі, маюць права на:

1) скасаванне працоўнага дагавора без захавання прадугле-

джаных дзеючым заканадаўствам тэрмінаў папярэджання адміністрацыі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый;

2) першачарговае працаўладкаванне выканаўчымі камітэтамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі на новым месцы жыхарства з улікам прафесіі і кваліфікацыі асобы, якая перасяляецца. Пры адсутнасці магчымасці такога працаўладкавання ім забяспечваецца прадастаўленне іншай работы з улікам іх жадання і грамадскіх патрэбнасцей або магчымасць навучання новым прафесіям (спецыяльнасцям) з захаваннем ва ўстаноўленым парадку заработнай платы на перыяд навучання і права на атрыманне ўзнагароджання за выслугу гадоў;

3) захаванне на перыяд працаўладкавання, але не больш чым на 4 месяцы, сярэдняй заработнай платы і бесперапыннага працоўнага стажу;

4) грашовую кампенсацыю за страчаную ў сувязі з перасяленнем маёмасць або атрыманне ва ўласнасць іншай раўнацэннай маёмасці.

Кампенсацыя ўключае ў сябе:

а) кошт будынкаў (жылыя дамы, садовыя домікі, дачы, гаражы, гаспадарчыя пабудовы), які выплачваецца ў поўным размеры па ацэнцы, вызначаемай страхавымі дакументамі, а пры нязгодзе ўладальніка — па ацэнцы бюро тэхнічнай інвентарызацыі выканаўчых камітэтаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў;

б) кошт дамашняй маёмасці, якая па ступені радыеактыўнага забруджання не можа быць перавезена на новае месца жыхарства, зыходзячы з яе фактычнага кошту, вызначаемага камісіямі адпаведных мясцовых Саветаў народных дэпутатаў з улікам зносу;

в) кошт застрахаванай сельскагаспадарчай жывёлы, што падлягае вымушанаму забою, які кампенсуецца ў поўным размеры па ацэнцы, вызначаемай страхавымі дакументамі;

г) кошт пладова-ягадных насаджэнняў, пасеваў і незастрахаванай сельскагаспадарчай жывёлы па расцэнках, зацверджаных Саветам Міністраў Беларускай ССР;

д) затраты па асваенню тэрыторыі садаводчага таварыства і зямельнага ўчастка, якія вызначаюцца ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Саветам Міністраў Беларускай ССР;

е) паенакапленне ў жыллёва-будаўнічых (жыллёвых) кааператывах;

5) кампенсацыя расходаў, звязаных з пераездам, якія ўключаюць у сябе:

а) выплату аднаразовай дапамогі ў размеры месячнага служ-

бовага акладу (тарыфнай стаўкі) па былым месцы работы і на кожнага члена сям'і, які пераязджае,— у размеры 1/4 дапамогі самога работніка, непрацуючым пенсіянерам — у размеры месячнай пенсіі;

б) аплату кошту праезду, расходаў па правозу маёмасці чыгуначным, водным і аўтамабільным транспартам (акрамя выпадкаў, калі адпаведныя транспартныя сродкі прадастаўляюцца бясплатна).

Аплата расходаў, звязаных з пераездам, праводзіцца раённымі, гарадскімі Саветамі народных дэпутатаў па былым месцы жыхарства;

6) забеспячэнне жылымі памяшканнямі ў спецыяльна ўзводзімых для гэтых мэт дамах;

7) першачарговае забеспячэнне жылой плошчай у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду;

8) пазачарговае набыццё ў прыватную ўласнасць жылых дамоў, незаселеных кватэр у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду, якія падлягаюць рэканструкцыі і капітальнаму рамонту, незалежна ад наяўнасці прапіскі ў выбраным для пражывання населеным пункце;

9) пазачарговае ўступленне ў жыллёвыя або жыллёва-будаўнічыя кааператывы па новым месцы жыхарства незалежна ад наяўнасці прапіскі ў выбраным для пражывання населеным пункце (акрамя горада Мінска і абласных цэнтраў);

10) пазачарговае прадастаўленне жылых памяшканняў грамадзянам з ліку непрацаздольных, якія перасяліліся (перасяляюцца) у адпаведнасці з гэтым Законам (па эвакуацыйных пасведчаннях) на жылую плошчу блізкіх сваякоў (бацькі, дзеці, унукі, родныя браты, сёстры) у якасці члена сям'і для сумеснага пражывання, калі ў выніку перасялення ўзнікае неабходнасць у паляпшэнні жыллёвых умоў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам;

11) часовае размяшчэнне ў жылых памяшканнях да прадастаўлення ва ўстаноўленым парадку жылой плошчы або да завяршэння будаўніцтва індывідуальнага жылога дома;

12) пазачарговае прадастаўленне зямельных участкаў для будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў (акрамя горада Мінска і абласных цэнтраў) і набыццё будаўнічых матэрыялаў, заключэнне з падраднымі арганізацыямі дагавораў на будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў з надворнымі пабудовамі;

13) атрыманне беспрацэнтнай пазыкі на будаўніцтва або набыццё індывідуальных і кааператыўных жылых дамоў з надворнымі пабудовамі з пагашэннем яе на працягу 25 гадоў пачынаючы з трэцяга года пасля атрымання пазыкі;

14) атрыманне беспрацэнтнай пазыкі на гаспадарчае абзаве-

дзенне ў размеры да пяці тысяч рублёў на сям'ю з тэрмінам пагашэння да 15 гадоў з моманту выдачы пазыкі;

15) выкарыстанне штогадовага водпуску ў зручны для іх час, а таксама атрыманне дадатковага водпуску без захавання заработнай платы тэрмінам да двух тыдняў у год;

16) выплату пры пераводзе ў адпаведнасці з медыцынскім заключэннем на ніжэйаплачваемую работу розніцы паміж былым заработкам і заработкам на новай рабоце. Гэта розніца выплачваецца прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі да аднаўлення працаздольнасці або ўстанаўлення інваліднасці;

17) выплату дапамогі па часовай непрацаздольнасці ў размеры 100 працэнтаў заработнай платы незалежна ад бесперапыннага працоўнага стажу;

18) першачарговае абслугоўванне ў лячэбна-прафілактычных установах і аптэках;

19) першачарговае забеспячэнне пуцёўкамі для санаторна-курортнага лячэння і адпачынку;

20) часткова аплачваемы водпуск па догляду дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў;

21) пазачарговае забеспячэнне месцамі ў дзіцячых дашкольных установах незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці, спецыялізаваных дзіцячых установах лячэбнага і санаторнага тыпу, піянерскіх і іншых аздараўленчых лагерах;

22) пераважнае забеспячэнне месцамі ў пансіянатах ветэранаў або дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў;

23) пазачарговае набыццё прадметаў дамашняй маёмасці, аналагічных тым, за якія выплачана кампенсацыя згодна з падпунктам «б» пункта 4 гэтага артыкула. Набыццё дамашняй маёмасці забяспечваецца са спецыяльнага фонду Савета Міністраў Беларускай ССР, створанага для гэтых мэт;

24) прыняцце на ўлік па новым месцы жыхарства на набыццё тавараў павышанага попыту з часу знаходжання на ўліку па былым месцы жыхарства.

Распаўсюдзіць на асоб, указаных у гэтым артыкуле, ільготы, прадугледжаныя пунктам 24 часткі першай артыкула 18 гэтага Закона.

**Артыкул 23.** Грамадзяне, якія пражываюць (працуюць) у зонах першачарговага адсялення і далейшага адсялення, маюць правы на:

1) бясплатнае атрыманне лякарстваў па рэцэптах урачоў;

2) часткова аплачваемы водпуск па догляду дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў. Пры гэтым аплата водпуску праводзіцца ў двайным размеры дапамогі, прадугледжанай дзеючым заканадаўствам;

3) аплату бальнічных лісткоў аднаму з бацькоў хворага дзіцяці ці падлетка або іншай асобе, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці, у размеры 100 працэнтаў заработнай платы за ўвесь перыяд хваробы, уключаючы санаторна-курортнае лячэнне, калі ўказаная вышэй асоба знаходзіцца ў санаторна-курортнай установе разам з дзіцем або падлеткам;

4) бясплатны праезд з хворым дзіцем на ўсіх відах транспарту (акрамя таксі) да месца лячэння і назад з правам пазачарговага набыцця білетаў;

5) штомесячную выплату непрацуючым жанчынам, што маюць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 16 гадоў, якім патрэбны па заключэнню ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі пабочны догляд, дапамогі ў размеры мінімальнай заработнай платы з улікам павышэння, прадугледжанага артыкулам 33 гэтага Закона;

6) дародавы водпуск жанчынам працягласцю 90 каляндарных дзён з правядзеннем аздараўленчых мерапрыемстваў за межамі тэрыторыі радыеактыўнага забруджання і 56 (у выпадках ускладненых родаў або нараджэння двух ці больш дзяцей — 70) каляндарных дзён пасля родаў. Пры гэтым агульная працягласць водпуску не можа быць менш за 146 (160) каляндарных дзён;

7) бясплатнае ўтрыманне дзяцей у дзіцячых дашкольных установах (для незабяспечаных месцамі выплачваецца кампенсацыя кошту харчавання), піянерскіх лагерах;

8) бясплатнае харчаванне школьнікаў, навучэнцаў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў і тэхнікумаў;

9) штогадовае бясплатнае забеспячэнне пуцёўкамі тэрмінам да двух месяцаў на аздараўленне дзяцей і падлеткаў, а таксама асоб, што суправаджаюць дзяцей дашкольнага ўзросту, дзяцей-інвалідаў і падлеткаў-інвалідаў, якім патрэбны па заключэнню ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі пабочны догляд;

10) павелічэнне на 100 працэнтаў устаноўленай дзеючым заканадаўствам дапамогі на дзяцей малазабяспечаным сем'ям;

11) забеспячэнне прадуктамі харчавання па медыцынскіх нормах;

12) штогадовы аплачваемы водпуск (працуючым) працягласцю 42 каляндарныя дні, без уліку дадатковага водпуску, які прадастаўляецца за работу ў шкодных умовах працы. Для работнікаў, у якіх у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам працягласць штогадовага водпуску больш за ўстаноўлены гэтым Законам, такі парадак не прымяняецца;

13) аднаразовую матэрыяльную дапамогу на аздараўленне ў размеры дзяржаўнай месячнай тарыфнай стаўкі (службовага акладу) пры прадастаўленні штогадовага водпуску;

14) вызваленне ад выплаты сельскагаспадарчага падатку;

15) вызваленне ад выплаты падатку на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных грамадзян. Ад падатку на маласямейных грамадзян таксама вызваляецца жонка (муж) пацярпеўшага (пацярпеўшай);

16) атрыманне тымі, хто выязджае, пазыкі ў памеры 10 тысяч рублёў на кожнага члена сям'і для самастойнага (пры жаданні) набыцця або будаўніцтва індывідуальнага жылога дома (кватэры). Пазыка выдаецца за кошт сродкаў, прызначаных для капітальнага будаўніцтва, па месцы набыцця або будаўніцтва жылля. Пагашэнне пазыкі праводзіцца банкам штоквартальна па меры асваення сродкаў на будаўніцтве або ажыццяўлення куплі-продажу, але не вышэй фактычных затрат.

Распаўсюдзіць на асоб, указаных у гэтым артыкуле, ільготы, прадугледжаныя пунктамі 2, 4 часткі першай артыкула 18, пунктамі 2 і 11 часткі першай артыкула 19 і пунктам 16 часткі першай артыкула 22 гэтага Закона.

На асоб, вызначаных пунктамі 1—6 артыкула 15, дзеці якіх нарадзіліся пасля выезду бацькоў (або аднаго з іх) з зон, указаных у пунктах 1—4 часткі другой артыкула 4, распаўсюджваюцца льготы, прадугледжаныя пунктамі 1—5 і 11 часткі першай дадзенага артыкула.

Асобы, якія пражываюць у гэтых зонах, пры перасяленні карыстаюцца льготамі, устаноўленымі ў артыкуле 22 гэтага Закона.

**Артыкул 24.** Грамадзяне, якія пражываюць (працуюць) у зоне з правам на адсяленне, маюць права на:

1) часткова аплачваемы водпуск па догляду дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў. Пры гэтым аплата водпуску праводзіцца ў паўтарачным памеры дапамогі, прадугледжанай дзеючым заканадаўствам;

2) аплачваемы штогадовы водпуск (працуючым) працягласцю 35 каляндарных дзён без уліку дадатковага водпуску, які прадастаўляецца за работу ў шкодных умовах працы. Для работнікаў, у якіх у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам працягласць штогадовага водпуску больш за ўстаноўлены гэтым Законам, такі парадак не прымяняецца;

3) аднаразовую матэрыяльную дапамогу на аздараўленне ў памеры 50 працэнтаў дзяржаўнай месячнай тарыфнай стаўкі (службовага акладу) пры прадастаўленні штогадовага водпуску.

На жыхароў указанай зоны распаўсюджваюцца льготы, прадугледжаныя пунктам 2 часткі першай артыкула 18, пунктам 11 часткі першай артыкула 19, падпунктамі «а», «г» і «е» пункта 4 і пунктамі 12 і 16 часткі першай артыкула 22 і пунктамі 1, 3—11 часткі першай артыкула 23 гэтага Закона.

Грамадзяне, што пражываюць у зоне з правам на адсяленне і

маюць у саставе сям'і дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, цяжарных жанчын і асоб, якім па медыцынскіх заключэннях не рэкамендавана пражыванне ў дадзенай зоне, маюць права на самастойнае перасяленне з прадастаўленнем ільгот, прадугледжаных пунктамі 4, 5, 8 і 13 часткі першай артыкула 22, пунктам 16 часткі першай артыкула 23 гэтага Закона.

**Артыкул 25.** Грамадзяне, якія пражываюць (працуюць) у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем, маюць права на:

1) 50-працэнтную скідку з кошту набываемых па рэцэптах урачоў лякарстваў для дзяцей;

2) штогадовае бясплатнае забеспячэнне пуцёўкамі тэрмінам да 1 месяца на аздараўленне дзяцей і падлеткаў, а таксама асоб, што суправаджаюць дзяцей дашкольнага ўзросту, дзяцей-інвалідаў і падлеткаў-інвалідаў, якім патрэбны па заключэнню ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі пабочны догляд;

3) дародавы водпуск працягласцю 84 каляндарныя дні і 56 (у выпадках ускладненых родаў або нараджэння двух і больш дзяцей — 70) каляндарных дзён пасля родаў. Пры гэтым агульная працягласць водпуску не можа быць меншай за 140 (154) каляндарных дзён;

4) атрыманне беспрацэнтнай пазыкі на будаўніцтва або набыццё жылля на новым месцы жыхарства асобамі, якія маюць у саставе сям'і дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, цяжарных жанчын і асоб, якім па медыцынскіх заключэннях не рэкамендавана пражыванне ў дадзенай зоне, пры добраахвотным перасяленні з населеных пунктаў, дзе доза апраменьвання насельніцтва перавышае дапушчальную мяжу 1 мЗв (0,1 бэр) у год;

5) аплачваемы штогадовы водпуск (працуючым) працягласцю 30 каляндарных дзён без уліку дадатковага водпуску, які прадастаўляецца за работу ў шкодных умовах працы. Для работнікаў, у якіх у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам працягласць штогадовага водпуску больш за ўстаноўлены гэтым Законам, такі парадак не прымяняецца;

6) атрыманне грашовай кампенсацыі за страчаную ў сувязі з перасяленнем маёмасць, у адпаведнасці з падпунктамі «а», «в» — «е» пункта 4 часткі першай артыкула 22, пры выездзе з зоны, дзе доза апраменьвання насельніцтва перавышае дапушчальную мяжу 1 мЗв (0,1 бэр) у год.

Распаўсюдзіць на асоб, указаных у гэтым артыкуле, ільготы, прадугледжаныя пунктам 11 часткі першай артыкула 19, пунктамі 12 і 16 часткі першай артыкула 22 і пунктамі 3—5, 8 і 11 часткі першай артыкула 23 гэтага Закона.

**Артыкул 26.** Грамадзяне, у якіх ёсць дачы, садовыя домікі, іншыя будынкі і насаджэнні на тэрыторыі, дзе немагчыма атры-

манне чыстай прадукцыі, карыстаюцца правам на кампенсацыю іх кошту ў адпаведнасці з гэтым Законам.

**Артыкул 27.** Грамадзяне, якія атрымалі ў спадчыну або на іншых падставах, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам, маёмасць, што знаходзіцца ў зонах эвакуацыі, першачарговага адсялення, далейшага адсялення і ў зоне з правам на адсяленне, маюць права на грашовую кампенсацыю ў парадку, устаноўленым падпунктам «а» пункта 4 часткі першай артыкула 22 гэтага Закона.

**Артыкул 28.** Маёмасць, за якую ў адпаведнасці з гэтым Законам выплачана кампенсацыя, пераходзіць ва ўласнасць Беларускай ССР. Распараджэнне і кіраванне дадзенай маёмасцю ажыццяўляюць мясцовыя Саветы народных дэпутатаў ва ўстаноўленым законам парадку.

**Артыкул 29.** Рабочыя і служачыя, а таксама ваеннаслужачыя, асобы радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, якія накіраваны або выехалі на работу ў зону першачарговага адсялення, далейшага адсялення, з правам на адсяленне і ў зону пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем, маюць права на захаванне жылой плошчы і чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў на прадпрыемствах, у арганізацыях і выканкомах мясцовых Саветаў народных дэпутатаў па былым месцы жыхарства.

**Артыкул 30.** Грамадзянам, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, устанаўліваецца штомесячная грашовая дапамога на кожнага члена сям'і ў наступных размерах:

1) у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем — 15 рублёў;

2) у зоне з правам на адсяленне — 20 рублёў;

3) у зоне далейшага адсялення і зоне першачарговага адсялення — 30 рублёў.

У такім жа парадку ўстанаўліваецца штомесячная грашовая дапамога ваеннаслужачым, асобам радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, а таксама членам іх сем'яў, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі.

**Артыкул 31.** Грамадзянам, якія пражываюць і працуюць у зоне з правам на адсяленне і зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем, на тэрыторыі сельскіх, пасялковых Саветаў народных дэпутатаў або калгасаў і саўгасаў, частка зямель якіх выведзена з землекарыстання, таму што ўвайшла ў зону эвакуацыі (30-кіламетровую зону), прадастаўляюцца льготы, прадугледжаныя пунктам 6 часткі першай артыкула 22, пунктам 2 часткі першай артыкула 30, пунктам 3 часткі першай артыкула 33 гэтага Закона.

**Артыкул 32.** Дзеянне льгот, прадугледжаных гэтым Законам для грамадзян, якія пражываюць у зонах першачарговага або далейшага адсялення, спыняецца па рашэнню мясцовых Саветаў народных дэпутатаў:

пры прадастаўленні перасяленцам ва ўстаноўленым дзеючым заканадаўствам парадку жылога памяшкання ў дамах дзяржаўнага або грамадскага жыллёвага фонду, фонду жыллёва-будаўнічых кааператываў;

у выпадку адмовы ад афіцыяльнай прапановы па перасяленню ў іншую мясцовасць;

з моманту набыцця або прыёмкі ў эксплуатацыю індывідуальнага жылога дома на тэрыторыі, не забруджанай радыеактыўнымі рэчывамі.

Парадак спынення права на льготы і кампенсацыі вызначаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

## Раздзел V
## АПЛАТА ПРАЦЫ ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ РАДЫЕАКТЫЎНАГА ЗАБРУДЖАННЯ

**Артыкул 33.** Аплата працы работнікаў, занятых у зонах тэрыторыі радыеактыўнага забруджання і на работах з павышанай радыеактыўнасцю, праводзіцца па дзяржаўных тарыфных стаўках (здзельных расцэнках) і службовых акладах, павышаных з улікам узроўню радыеактыўнага забруджання, складанасці работ, якія выконваюцца, і ўмоў працы ў наступных размерах:

1) ад 1 да 5 Кі/кв. км на 15—20 працэнтаў;

2) ад 5 да 10 Кі/кв. км на 20—30 працэнтаў;

3) ад 10 да 15 Кі/кв. км на 30—50 працэнтаў;

4) ад 15 да 30 Кі/кв. км на 50—75 працэнтаў;

5) 30 Кі/кв. км і вышэй на 75—100 працэнтаў.

Пералік відаў работ і канкрэтныя размеры працэнтных надбавак у залежнасці ад складанасці работ, якія выконваюцца, і ўмоў працы ўстанаўліваюцца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

У такім жа парадку ўводзяцца працэнтныя надбаўкі да акладаў па пасадзе, воінскаму (спецыяльнаму) званню ваеннаслужачым, асобам радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, а таксама да стыпендый студэнтаў.

**Артыкул 34.** Аплата працы грамадзян, якія працуюць на тэрыторыі калгаса, саўгаса або іншага прадпрыемства, арганізацыі, у якіх больш за палавіну сельскагаспадарчых угоддзяў адносіцца

да зоны з павышаным узроўнем забруджання, праводзіцца ў размеры, прадугледжаным для дадзенай зоны.

**Артыкул 35.** Работнікам, якія звязаны з вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі, пры забароне яе вытворчасці ў зонах першачарговага адсялення і далейшага адсялення выплачваецца ў выглядзе кампенсацыі за вымушаны прастой 70 працэнтаў сярэдняй заработнай платы па папярэдняй рабоце да моманту адсялення.

**Артыкул 36.** Аплата працы медыцынскіх і фармацэўтычных работнікаў, уключаючы медыцынскіх работнікаў Узброеных Сіл, органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, занятых (пастаянна ці часова) аказаннем медыцынскай дапамогі насельніцтву, якое пражывае на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі, праводзіцца на кантрактнай аснове.

**Артыкул 37.** Аплата працы работнікаў, занятых спецыяльнай перапрацоўкай, утылізацыяй і даследаваннем сыравіны і матэрыялаў з павышанай радыеактыўнасцю, праводзіцца па павышаных на 25 працэнтаў дзяржаўных тарыфных стаўках (здзельных расцэнках) і службовых акладах. Пры размяшчэнні прадпрыемстваў за межамі зон радыеактыўнага забруджання ўказаная павышаная аплата праводзіцца пры пастаяннай магутнасці дозы знешняга выпраменьвання на рабочым месцы больш як 50 мікрарэнтген у гадзіну. Пры рамонце і абслугоўванні тэхнічных сродкаў, абсталявання, іх спецыяльнай апрацоўцы, правядзенні дазіметрычнага і радыеметрычнага кантролю аплата працы праводзіцца па павышаных на 25 працэнтаў дзяржаўных тарыфных стаўках (здзельных расцэнках), службовых акладах пры паверхневым забруджанні, якое перавышае ўстаноўленыя нормы.

**Артыкул 38.** Асобы, якія працуюць за межамі тэрыторый радыеактыўнага забруджання, занятыя на кантролі, рамонце, абслугоўванні і спецыяльнай апрацоўцы тэхнічных сродкаў і абсталявання, што маюць радыеактыўнае забруджанне вышэйшае за ўстаноўленыя нормы, карыстаюцца правам на дадатковы аплачваемы штогадовы водпуск працягласцю 7 каляндарных дзён без уліку дадатковага водпуску, які прадастаўляецца за работу ў шкодных умовах працы.

**Артыкул 39.** Работнікам, камандзіраваным на будаўніцтва аб'ектаў, звязаных з ліквідацыяй вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, выплачваецца 75 працэнтаў сярэдняй заработнай платы па асноўным месцы работы ўзамен сутачных з пакрыццём затрат за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца рэспублікай на ўказаныя мэты.

**Артыкул 40.** Работнікам, у тым ліку ваеннаслужачым, асобам радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, часова пераведзеным або камандзіра-

ваным для выканання работ у населеных пунктах, у якіх прадугледжаны льготы па аплаце працы, захоўваецца сярэдняя заработная плата па асноўнай і сумяшчаемай рабоце (пасадзе), выплачваюцца сутачныя ў размеры, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам. Аплата працы ва ўказаных населеных пунктах за выкананую работу праводзіцца па павышаных дзяржаўных тарыфных стаўках (здзельных расцэнках) або службовых акладах у парадку, устаноўленым артыкулам 33.

Працэнтныя надбаўкі да дзяржаўных тарыфных ставак (здзельных расцэнак), службовых акладаў, акладаў па воінскаму і спецыяльнаму званню за работу, звязаную з тушэннем пажараў у зонах эвакуацыі, абавязковага адсялення і далейшага адсялення, павялічваюцца ў два разы.

**Артыкул 41.** Ваеннаабавязаным, прызваным на зборы і накіраваным для выканання работ па ліквідацыі вынікаў катастрофы ў населеныя пункты з павышанай радыеактыўнасцю, у якіх прадугледжаны льготы па аплаце працы, выплачваецца дзяржаўная тарыфная стаўка (службовы аклад) у павышаным размеры за ўсе каляндарныя дні (уключаючы выхадныя і святочныя) у адпаведнасці з артыкулам 33 гэтага Закона звыш захоўваемай сярэдняй заработнай платы па асноўным месцы работы на падставе даведкі, выдадзенай воінскай часцю.

**Артыкул 42.** Грамадзяне, якія накіроўваюцца (камандзіруюцца) для часовай работы і ў службовыя камандзіроўкі ў зоны першачарговага адсялення, далейшага адсялення і ў зону з правам на адсяленне, у тым ліку ваеннаслужачыя, асобы радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, маюць права на аплачваемы штогадовы водпуск у парадку, устаноўленым гэтым Законам для адпаведных зон, грашовую дапамогу за пражыванне на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання ў адпаведнасці з артыкулам 30 і павышаную аплату працы ў адпаведнасці з артыкулам 33 гэтага Закона за фактычна адпрацаваны час (час пражывання). Тэрмін бесперапыннай камандзіроўкі ў гэтыя зоны дазваляецца да аднаго года.

Асобы, якія ўтрымліваюцца ў лячэбна-працоўных установах Міністэрства ўнутраных спраў, маюць права на грашовую дапамогу за пражыванне на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання ў адпаведнасці з артыкулам 30 і павышаную аплату працы ў адпаведнасці з артыкулам 33 гэтага Закона за фактычна адпрацаваны час (час пражывання).

**Артыкул 43.** Работнікам, у тым ліку ваеннаслужачым і асобам радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, якія пастаянна працуюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, выплачваецца дадатковае ўзнагароджанне за выслугу гадоў, што вызначаецца доляй ад

дзяржаўнай месячнай тарыфнай стаўкі (службовага акладу), грашовага забеспячэння, у наступных размерах:

| Пры стажы работы на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання | У зонах са шчыльнасцю радыеактыўнага забруджання (Кі/кв. км): | | |
| --- | --- | --- | --- |
| | ад 1 да 5 | ад 5 да 15 | ад 15 і вышэй |
| ад 1 да 3 гадоў | 0,3 | 0,6 | 0,8 |
| ад 3 да 5 гадоў | 0,5 | 0,8 | 1,0 |
| ад 5 да 10 гадоў | 0,7 | 1,0 | 1,2 |
| ад 10 да 15 гадоў | 0,9 | 1,2 | 1,5 |
| звыш 15 гадоў | 1,2 | 1,5 | 2,0 |

**Артыкул 44.** Узнагароджанне за выслугу гадоў спецыялістам лясной гаспадаркі выплачваецца незалежна ад аб'ёму нарыхтоўкі і вывазу драўніны.

## Раздзел VI
## ПЕНСІЁННАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ГРАМАДЗЯН, ПАЦЯРПЕЎШЫХ АД КАТАСТРОФЫ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ АЭС

**Артыкул 45.** Грамадзянам, пацярпеўшым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, пенсіі па ўзросту назначаюцца са змяншэннем узросту, устаноўленага артыкулам 13 Закона СССР «Аб пенсіённым забеспячэнні грамадзян у СССР», у наступных размерах:

1) удзельнікам ліквідацыі вынікаў аварыі, занятым на работах:

у межах 10-кіламетровай зоны ў 1986 годзе або не менш як 10 сутак у 1987 годзе — на 10 гадоў;

у межах 30-кіламетровай зоны (выключаючы 10-кіламетровую зону) у 1986 годзе не менш як 3 сутак або ў 1987 годзе не менш як 14 сутак — на 5 гадоў;

2) асобам, якія эвакуіраваны з зоны эвакуацыі, а таксама пастаянна пражывалі ў гэтай зоне і самастойна пакінулі яе пасля катастрофы,— на 5 гадоў;

3) асобам, якія пражываюць (пражывалі) у зоне першачарговага адсялення,— на 3 гады і дадаткова на 1 год за кожны год пражывання або работы, але не больш чым на 5 гадоў увогуле;

4) асобам, якія пражываюць (пражывалі) у зоне далейшага адсялення,— на 2 гады і дадаткова на 1 год за кожныя 2 гады пражывання або работы, але не больш чым на 4 гады ўвогуле;

5) асобам, якія пражываюць (пражывалі) у зоне з правам на адсяленне,— на 1 год і дадаткова на 1 год за кожныя 3 гады пражывання або работы, але не больш чым на 3 гады ўвогуле;

6) асобам, якія пражываюць (пражывалі) у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем,— на 0,5 года і дадаткова на 1 год за кожныя 4 гады пражывання або работы, але не больш чым на 2,5 года ўвогуле.

Першапачатковая велічыня зніжэння пенсіённага ўзросту, устаноўленая пунктамі 3—6 часткі першай гэтага артыкула, прадугледжваецца для асоб, якія пражывалі (працавалі) на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання ў перыяд з 26 красавіка па 31 мая 1986 года, а таксама для асоб, занятых у гэты перыяд на асобных відах работ (пералік зацвярджаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР) у зоне першачарговага адсялення не менш як 5 дзён.

**Артыкул 46.** Грамадзянам, якія заняты не менш як 10 гадоў на асобных работах у зоне з правам на адсяленне, а ў зоне з перыядычным радыяцыйным кантролем не менш як 15 гадоў, пенсіі па ўзросту назначаюцца:

мужчынам — па дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш як 25 гадоў;

жанчынам — па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш як 20 гадоў.

Пералік асобных работ, што даюць права на пенсію на падставе гэтага артыкула, зацвярджаецца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

**Артыкул 47.** Асобам, якія атрымалі прафесіянальнае захворванне пры эксплуатацыі Чарнобыльскай АЭС і ліквідацыі вынікаў катастрофы ў зоне эвакуацыі, а таксама асобам, якія сталі інвалідамі ў выніку чарнобыльскай катастрофы, пенсіі па ўзросту назначаюцца мужчынам па дасягненні 50 гадоў і пры стажы работы не менш як 20 гадоў, жанчынам — па дасягненні 45 гадоў і пры стажы работы не менш як 15 гадоў незалежна ад працягласці работы ў шкодных умовах працы.

**Артыкул 48.** Пенсіі па інваліднасці, што настала ў выніку калецтва ці захворвання, выкліканага катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, назначаюцца ў парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам. Пры гэтым пенсіі назначаюцца ў размеры пакрыцця фактычнага ўрону, які вызначаецца ва ўстаноўленым парадку. Па жаданню грамадзяніна размер пенсіі вылічваецца з аплаты за работу па ліквідацыі вынікаў гэтай катастрофы, але не больш чым за 12 месяцаў.

Пенсіі па інваліднасці ваеннаслужачым, асобам начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі ў выніку ўказаных прычын могуць быць назначаны ў парадку і па нормах, устаноўленых дзеючым заканадаўствам у выпадку ранення, кантузіі або калецтва, атрыманых пры выкананні абавязкаў ваеннай службы (службовых абавязкаў). Пры гэ-

тым размер пенсій ваеннаслужачым звыштэрміновай службы, асобам начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі можа быць вылічаны з грашовага забеспячэння, павялічанага за работу па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Ваеннаслужачым радавога, сяржанцкага і старшынскага саставу тэрміновай службы пенсія па інваліднасці ў выніку ўказаных прычын можа быць вылічана па іх жаданню з пяцікратнага размеру мінімальнай заработнай платы.

**Артыкул 49.** Чарговы пераагляд асоб, якія поўнасцю або часткова страцілі працаздольнасць у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, праводзіцца ўрачэбна-працоўнымі экспертнымі камісіямі праз 5 гадоў.

**Артыкул 50.** Пенсіі з выпадку страты карміцеля назначаюцца ў парадку, прадугледжаным артыкулам 48 гэтага Закона.

**Артыкул 51.** Работнікам, ваеннаслужачым, ваеннаабавязаным, прызваным на зборы, асобам радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, занятым на эксплуатацыі Чарнобыльскай АЭС і ліквідацыі вынікаў катастрофы ў зоне эвакуацыі, час работы (службы) з моманту аварыі да 31 снежня 1987 года залічваецца ў працоўны стаж (выслугу гадоў) і ў стаж, які дае права на льготную пенсію па спісу № 1, у трохкратным размеры, а ў перыяд з 1 студзеня 1988 года — у паўтарачным размеры.

Гэтым жа асобам, занятым у зонах першачарговага і далейшага адсялення, час работы (службы) з моманту аварыі залічваецца ў працоўны стаж (выслугу гадоў) у паўтарачным размеры.

**Артыкул 52.** Ваеннаслужачым, асобам радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, вызначаным пунктамі 1, 2 артыкула 15, а таксама тым, хто адслужыў (адпрацаваў) больш трох гадоў у зоне эвакуацыі, першачарговага адсялення або далейшага адсялення, пенсіі налічваюцца за выслугу 20 гадоў у размеры 45 працэнтаў адпаведных сум грашовага забеспячэння і 3 працэнтаў за кожны год выслугі звыш 20 гадоў, але не больш 75 працэнтаў гэтых сум з улікам ільготных выплат.

**Артыкул 53.** Удзельнікам ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, грамадзянам, якія працуюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, а таксама эвакуіраваным, адсяленым і самастойна пакінуўшым тэрыторыі, што аднесены да зон, указаных у пунктах 1—4 часткі другой артыкула 4 гэтага Закона, пенсіі выплачваюцца ў поўным размеры незалежна ад атрымліваемага заработку (даходу).

**Артыкул 54.** Удзельнікам ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і іншым грамадзянам, якія сталі інвалідамі

з прычыны гэтай катастрофы, выплачваюцца надбаўкі да атрымліваемай пенсіі ў наступных размерах ад мінімальнай пенсіі па ўзросту:

інвалідам I групы — 100 працэнтаў;

інвалідам II групы — 75 працэнтаў;

інвалідам III групы — 50 працэнтаў.

Іншым удзельнікам ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, указаным у пункце 1 часткі першай артыкула 13 гэтага Закона, а таксама грамадзянам, адселеным з зон эвакуацыі, першачарговага і далейшага адсялення, пенсіі павышаюцца на 25 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту.

**Артыкул 55.** Пенсіі непрацуючым пенсіянерам, стыпендыі студэнтам і навучэнцам прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, дапамогі насельніцтву, якое пражывае на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, павышаюцца ў парадку, устаноўленым артыкулам 33 гэтага Закона.

Канкрэтныя размеры працэнтных надбавак устанаўліваюцца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

**Артыкул 56.** Пенсіянерам, якія працуюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, павышаецца або заработная плата або пенсія (па іх выбару) у парадку, устаноўленым артыкулам 33 гэтага Закона.

## Раздзел VII
## ПАРАДАК ПРАХОДЖАННЯ ВОІНСКАЙ СЛУЖБЫ НА ТЭРЫТОРЫІ РАДЫЕАКТЫЎНАГА ЗАБРУДЖАННЯ

**Артыкул 57.** У зонах эвакуацыі, першачарговага адсялення і далейшага адсялення забараняецца дыслакацыя воінскіх часцей. У выпадку неабходнасці выканання ва ўказаных зонах службовых абавязкаў накіраванне ваеннаслужачых у гэтыя зоны ажыццяўляецца на добраахвотнай аснове, акрамя выпадкаў, прадугледжаных Законам СССР «Аб прававым рэжыме надзвычайнага становішча».

**Артыкул 58.** У зоне з правам на адсяленне і зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем праходжанне службы (воінскай службы) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

**Артыкул 59.** Грамадзяне, якія прызываюцца з зон першачарговага адсялення, далейшага адсялення і зоны з правам на адсяленне, накіроўваюцца для праходжання абавязковай тэрміновай службы ў воінскія часці, установы і на пасады, дзе выключана іх радыяцыйнае апраменьванне ў перыяд праходжання службы.

**Артыкул 60.** Сяржанцкі і радавы састаў тэрміновай службы, якія праходзіць воінскую службу ў зонах эвакуацыі, першачарго-

вага адсялення, далейшага адсялення мае права па заканчэнні 12 месяцаў на водпуск працягласцю 30 сутак (без уліку часу на праезд да месца правядзення водпуску і назад).

**Артыкул 61.** Ваеннаслужачыя, за выключэннем указаных у артыкулах 59 і 60 гэтага Закона, а таксама асобы радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, якія пражываюць і нясуць службу на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання (ад 5 Кі/кв. км і вышэй), маюць права на дадатковы аплачваемы водпуск працягласцю 15 сутак, а ў зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем — 7 сутак.

**Артыкул 62.** Ваеннаслужачыя (за выключэннем ваеннаслужачых тэрміновай службы), якія праслужылі не менш як 2 гады ў зонах першачарговага адсялення, далейшага адсялення, з правам на адсяленне, маюць права на замену, а тыя, хто праходзіць службу ў зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем,— на прамую замену месца праходжання воінскай службы ў тэрміны, устаноўленыя Саветам Міністраў Саюза ССР.

## Раздзел VIII
## МЕДЫЦЫНСКАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

**Артыкул 63.** Грамадзяне, указаныя ў артыкуле 15 гэтага Закона, забяспечваюцца сістэматычным медыцынскім абследаваннем і наглядам.

Парадак медыка-санітарнага забеспячэння ўказаных асоб вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Беларускай ССР.

Неабходныя звесткі аб гэтых асобах і іх дзецях уключаюцца ў Рэспубліканскі дзяржаўны рэгістр у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Беларускай ССР.

**Артыкул 64.** Грамадзяне, на якіх распаўсюджваецца дзеянне гэтага Закона, павінны праходзіць медыцынскае абследаванне ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Беларускай ССР.

**Артыкул 65.** Грамадзяне, пацярпеўшыя ад чарнобыльскай катастрофы, забяспечваюцца харчаваннем у спецыялізаваных лячэбных, лячэбна-санаторных і курортных установах па павышаных нормах.

**Артыкул 66.** Ваеннаслужачыя і асобы радавога і начальніцкага саставу органаў унутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, якія заняты на работах і нясуць службу ў зонах эвакуацыі, першачарговага адсялення і далейшага адсялення, забяспечваюцца трохразовым гарачым харчаваннем з разліку 2 рублі 85 капеек (у далейшым — з улікам індэксацыі цэн).

**Артыкул 67.** Грамадзяне, якія падлягаюць абавязковаму медыцынскаму і медыка-генетычнаму абследаванню, пры ўхіленні

ад яго праходжання могуць быць пазбаўлены льгот, прадугледжаных гэтым Законам, у парадку, установленым Саветам Міністраў Беларускай ССР.

## Раздзел IX
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 68.** Удзельнікам ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы выдаецца пасведчанне і нагрудны знак «Удзельнік ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС». Форма пасведчання і ўзор нагруднага знака зацвярджаюцца Дзяржаўным камітэтам Беларускай ССР па праблемах вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

**Артыкул 69.** Грамадзянам, пацярпеўшым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, выдаюцца пасведчанні ўзору, установленага Дзяржаўным камітэтам Беларускай ССР па праблемах вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

**Артыкул 70.** Палажэнні аб пасведчаннях зацвярджаюцца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

**Артыкул 71.** Указаныя ў артыкулах 68 і 69 гэтага Закона пасведчанні з'яўляюцца дакументам, які пацвярджае правы і льготы, установленыя гэтым Законам.

**Артыкул 72.** Выдача пасведчанняў і нагрудных знакаў удзельнікам ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы праводзіцца міністэрствамі і ведамствамі Беларускай ССР, выканкомамі абласных Саветаў народных дэпутатаў, ваеннымі камісарыятамі і органамі сацыяльнага забеспячэння. Насельніцтву, якое пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, выдача пасведчанняў праводзіцца выканкомамі абласных, гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў на падставе дакументаў, што пацвярджаюць факт удзелу ў работах па ліквідацыі вынікаў катастрофы, эвакуацыі, адсялення, выезду або пражывання на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання.

**Артыкул 73.** Грамадзяне, якія перасяліліся ў Беларускую ССР з тэрыторый радыеактыўнага забруджання РСФСР і Украінскай ССР, карыстаюцца ўсімі льготамі, прадугледжанымі гэтым Законам. Правы іх павінны быць урэгуляваны міжрэспубліканскімі пагадненнямі.

**Артыкул 74.** Дзяржаўны кантроль вымярэнняў радыеактыўнага забруджання навакольнага прыроднага асяроддзя і ўсіх відаў сыравіны і прадукцыі ажыццяўляе Беларускае рэспубліканскае ўпраўленне Дзяржстандарта СССР.

**Артыкул 75.** Службовыя і іншыя асобы, вінаватыя ў парушэнні патрабаванняў гэтага Закона, нясуць крымінальную, адміністрацыйную і іншую адказнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

**Артыкул 76.** Усе даплаты, ільготы, кампенсацыі, выражаныя ў грашовай форме, падлягаюць індэксацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларускай ССР і Саюза ССР.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

22 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 634—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 112 Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Беларускай ССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС»

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Беларускай ССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» з моманту яго прыняцця.

Пункты 7, 9 артыкула 19, пункт 4 «д» артыкула 22, пункты 3—6, 8, 13 артыкула 23, пункт 3 артыкула 24, пункты 1—3, 5 артыкула 25, артыкулы 26, 27, пункт 1 артыкула 33, артыкулы 34, 38, 43, 45, 46, 52 і 53 указанага Закона ўводзяцца ў дзеянне пасля вырашэння пытання аб фінансаванні прадугледжаных у іх кампенсацый з саюзнага бюджэту.

Артыкулы 59—62 уводзяцца пасля прыняцця адпаведнага рашэння Вярхоўным Саветам Саюза ССР.

2. У далейшым, да прывядзення заканадаўства Беларускай ССР у адпаведнасць з Законам Беларускай ССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», дзеючыя акты заканадаўства прымяняюцца, паколькі яны не супярэчаць гэтаму Закону.

3. Даручыць Савету Міністраў Беларускай ССР у двухмесячны тэрмін пасля ўвядзення ў дзеянне ўказанага Закона:

3.1. Прадставіць у Вярхоўны Савет Беларускай ССР прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Беларускай ССР у адпаведнасць з Законам Беларускай ССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

3.2. Прывесці рашэнні Урада Беларускай ССР у адпаведнасць з указаным Законам.

3.3. Забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Беларускай ССР іх нарматыўных актаў, у тым ліку інструкцый, якія супярэчаць указанаму Закону.

4. Савету Міністраў Беларускай ССР:

4.1. Вызначыць этапы адсялення грамадзян з тэрыторыі радыеактыўнага забруджання ў адпаведнасці з Канцэпцыяй пражывання насельніцтва ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

4.2. Разгледзець пытанне аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пражываюць у гарадах, нераўнамерна забруджаных радыенуклідамі, маючы на ўвазе распаўсюдзіць на іх асобныя палажэнні ўказанага Закона.

4.3. Забяспечыць распрацоўку норм радыяцыйнай бяспекі, асноўных санітарных правіл работы (пражывання) на тэрыторыях, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджанню.

4.4. У месячны тэрмін устанавіць пералік работ і размеры аплаты працы па павышаных дзяржаўных тарыфных стаўках (службовых акладах) у зонах тэрыторыі радыеактыўнага забруджання.

4.5. Забяспечыць распрацоўку ўмоў рэжыму працы і адпачынку, аплаты працы і размеры матэрыяльных і сацыяльных ільгот і кампенсацый для працуючых у зоне эвакуацыі.

4.6. Разгледзець пытанні, звязаныя з арганізацыяй жыццядзейнасці насельніцтва, якое пражывае ў раённых цэнтрах, зыходзячы з прынятай Канцэпцыі, і прыняць адпаведныя рашэнні.

4.7. Распрацаваць палажэнне аб парадку аплаты працы па кантракту для медыцынскіх і фармацэўтычных работнікаў, занятых (пастаянна або часова) аказаннем медыцынскай дапамогі насельніцтву, якое пражывае на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі.

4.8. У мэтах захавання бяспечных умоў працы забяспечыць калгасы, саўгасы і іншыя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання, спецыяльнымі сродкамі вытворчасці.

4.9. Стварыць спецыяльныя фонды для забеспячэння набыцця дамашняй маёмасці грамадзянамі, якія маюць дадзенае права ў адпаведнасці з гэтым Законам.

5. Дзяржаўнаму камітэту Беларускай ССР па праблемах вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у тэрмін да 1 студзеня 1992 года правесці карэкціроўку зон, вызначаных гэтым Законам, з улікам забруджання тэрыторыі стронцыем-90 і плутоніем-239, 240.

6. Устанавіць, што ўсе расходы, звязаныя з ажыццяўленнем гэтага Закона, пакрываюцца рэспубліцы за кошт сродкаў саюзнага бюджэту.

7. Савету Міністраў Беларускай ССР прыняць канкрэтныя меры па пакрыццю ўрону, прычыненага рэспубліцы ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

8. Савету Міністраў Беларускай ССР, спецыяльна ўпаўнаважаным на тое дзяржаўным органам, мясцовым Саветам народных дэпутатаў забяспечыць рэалізацыю палажэнняў указанага Закона.

9. Камісіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па праблемах чарнобыльскай катастрофы забяспечыць кантроль за выкананнем Закона Беларускай ССР «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», сістэматычнае вывучэнне і абагульненне практыкі прымянення ўказанага Закона, а ў неабходных выпадках уносіць прапановы аб змяненнях заканадаўчых актаў Беларускай ССР.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

22 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 635—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 113 Аб Комплекснай мэтавай праграме Беларускай ССР «Ахова мацярынства і дзяцінства ва ўмовах уздзеяння вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» на 1991—1995 гады*

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Прыняць Комплексную мэтавую праграму Беларускай ССР «Ахова мацярынства і дзяцінства ва ўмовах уздзеяння вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» на 1991—1995 гады.

2. Даручыць Савету Міністраў Беларускай ССР да 1 ліпеня 1991 года:

---

* *Апублікавана ў газеце «Звязда» 15 сакавіка 1991 года.*

зацвердзіць канкрэтныя мерапрыемствы па выкананню дадзенай Праграмы, звярнуўшы асаблівую ўвагу на аснашчэнне медыцынскіх устаноў сучасным абсталяваннем, медыкаментамі;

распрацаваць мерапрыемствы па прыцягненню арганізацый сістэмы ААН да ажыццяўлення мер па змякчэнню і пераадоленню вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

вызначыць парадак даследавання сацыяльна-псіхалагічнай абстаноўкі ў раёнах, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджанню, і ў месцах перасялення;

перагледзець структуру органаў аховы здароўя рэспублікі з улікам узнікшых праблем па пераадоленню вынікаў чарнобыльскай катастрофы.

3. Савету Міністраў Беларускай ССР значна палепшыць інфармаванне насельніцтва аб радыяцыйнай абстаноўцы ў рэспубліцы, а таксама санітарна-асветніцкую работу сярод насельніцтва.

4. Савету Міністраў Беларускай ССР, выканаўчым камітэтам абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў, адпаведным міністэрствам і ведамствам рэспублікі забяспечыць безумоўнае выкананне заданняў Комплекснай мэтавай праграмы Беларускай ССР «Ахова мацярынства і дзяцінства ва ўмовах уздзеяння вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» на 1991—1995 гады.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

21 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 631—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 114 Аб перадачы некаторых паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Беларускай ССР у сферы рэгулявання зямельных адносін Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай ССР*

У адпаведнасці з артыкуламі 5 і 124 Кодэкса Беларускай ССР аб зямлі Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

---

* *Апублікавана ў газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Белорусская нива» 26 лютага 1991 года.*

Перадаць прадугледжаныя Кодэксам Беларускай ССР аб зямлі паўнамоцтвы Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па прадастаўленню і адабранню зямель, а таксама па вырашэнню зямельных спрэчак Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

15 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 610—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 115 Аб правядзенні зямельнай рэформы ў рэспубліцы*

Зямельная рэформа з'яўляецца састаўной часткай эканамічнай рэформы, якая ажыццяўляецца ў Беларускай ССР у сувязі з пераходам народнай гаспадаркі на работу ва ўмовах рыначнай эканомікі. Задача рэформы заключаецца ў пераразмеркаванні зямель з мэтай стварэння ўмоў раўнапраўнага развіцця розных форм гаспадарання на зямлі, фарміравання шматукладнай эканомікі ў аграрным сектары і дасягнення на гэтай аснове стабільнага нарошчвання вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Аб'явіць землі Беларускай ССР аб'ектам зямельнай рэформы з моманту прыняцця гэтай Пастановы.

На перыяд правядзення зямельнай рэформы ўсе пытанні рэгулявання зямельных адносін перадаюцца Саветам народных дэпутатаў у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

2. Правядзенне зямельнай рэформы ўскласці на абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы народных дэпутатаў, Камітэт па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Беларускай ССР сумесна з Дзяржаўным камітэтам Беларускай ССР па сельскай гаспадарцы і харчаванню, Міністэрствам лясной гаспадаркі БССР, іншымі зацікаўленымі міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Беларускай ССР.

На Камітэт па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Беларускай ССР ускладаюцца землеўпарадкавальная, арганізацыйная, кантрольная і кансультацыйная функцыі пры правядзенні зямельнай рэформы.

---

* *Апублікавана ў газетах: «Звязда» — 1 сакавіка 1991 года, «Советская Белоруссия» — 2 сакавіка 1991 года, «Белорусская нива» — 5 сакавіка 1991 года.*

Для прававога забеспячэння зямельнай рэформы і каардынацыі работ па яе правядзенню, рашэння іншых зямельных пытанняў рэкамендаваць мясцовым Саветам народных дэпутатаў стварыць камісіі з ліку дэпутатаў, землеўпарадчыкаў і іншых спецыялістаў, а таксама прадстаўнікоў грамадскасці.

Практычнае ажыццяўленне землеўпарадкавальных работ забяспечваецца Рэспубліканскім праектным інстытутам па землеўпарадкаванню «Белдзіпразем» і яго філіяламі.

3. Мясцовым Саветам народных дэпутатаў, Камітэту па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Беларускай ССР, Дзяржаўнаму камітэту Беларускай ССР па сельскай гаспадарцы і харчаванню забяспечыць правядзенне ў 1991 годзе інвентарызацыі зямель калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці з мэтай стварэння спецыяльнага фонду зямельнага запасу мясцовых Саветаў народных дэпутатаў для надзялення зямельнымі ўчасткамі юрыдычных і фізічных асоб.

4. Мясцовым Саветам народных дэпутатаў:

арганізаваць рэгістрацыю грамадзян, якія жадаюць стварыць сялянскую (фермерскую) гаспадарку, расшырыць асабістую падсобную гаспадарку, займацца індывідуальным садаводствам, атрымаць у карыстанне зямельныя ўчасткі для агародніцтва, касьбы і выпасу жывёлы, а таксама ўлік і аналіз хадайніцтваў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый аб выдзяленні ім зямель для вядзення падсобнай сельскай гаспадаркі, калектыўнага садаводства і агародніцтва;

на аснове матэрыялаў інвентарызацыі зямель сфарміраваць на тэрыторыі кожнага сельскага (пасялковага) Савета народных дэпутатаў спецыяльны фонд зямельнага запасу за кошт угоддзяў, якія выкарыстоўваюцца нерацыянальна, зямель, якія выкарыстоўваюцца не па мэтаваму прызначэнню або з парушэннем устаноўленых патрабаванняў, а таксама за кошт сельскагаспадарчых угоддзяў, выбыўшых з абароту або пераведзеных у менш каштоўныя землі, зямель ляснога фонду, не пакрытых лесам або занятых малакаштоўнымі ляснымі пародамі і прыгодных па глебавых і іншых умовах для выкарыстання ў якасці сельскагаспадарчых угоддзяў, іншых зямель сельскагаспадарчага прызначэння. У першачарговым парадку адшукаць і выдзеліць ужо вясной гэтага года неабходную колькасць зямель для задавальнення неадкладных патрэбнасцей насельніцтва;

з улікам патрэбнасцей у зямельных участках грамадзян, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый правесці ва ўстаноўленым парадку пераразмеркаванне зямель паміж землекарыстальнікамі;

аператыўна, не пазней чым у месячны тэрмін, разглядаць

усе пытанні, якія ўзнікаюць пры выдзяленні зямель для вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, і прымаць вычарпальныя рашэнні.

5. Абласным і раённым Саветам народных дэпутатаў, Камітэту па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Беларускай ССР з удзелам сельскіх (пасялковых) Саветаў народных дэпутатаў вызначыць межы зямель сельскіх населеных пунктаў з улікам задавальнення патрэбнасцей грамадзян у зямельных участках для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі з магчымым расшырэннем яе плошчы да 1 гектара ворыва і да 1 красавіка 1991 года перадаць гэтыя землі ў веданне сельскіх (пасялковых) Саветаў народных дэпутатаў. Пры правядзенні гэтай работы ў састаў сельскіх населеных пунктаў могуць уключацца ўчасткі сенажацей і паш, размешчаных па сумежнасці з граніцамі гэтых пунктаў.

6. Абласным і раённым Саветам народных дэпутатаў, Камітэту па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Беларускай ССР, Дзяржаўнаму камітэту Беларускай ССР па сельскай гаспадарцы і харчаванню пры ажыццяўленні зямельнай рэформы вызначыць магчымыя шляхі і формы пераўтварэння неэфектыўна працуючых калгасаў і саўгасаў у асацыяцыі сялянскіх гаспадарак, кааператываў, а таксама прадастаўлення іх зямель арандатарам, сялянскім гаспадаркам, прамысловым і іншым прадпрыемствам.

Прымусовае расфарміраванне калгасаў, саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў недапушчальна.

7. Устанавіць, што пры адмове калгасам, саўгасам у выдзяленні канкрэтнага зямельнага ўчастка членам калгасаў, работнікам саўгасаў, якія выходзяць з іх саставу для стварэння сялянскай гаспадаркі, раённы Савет народных дэпутатаў мае права самастойна (па заключэнню зямельнай камісіі) вызначыць месцараспалажэнне зямельнага ўчастка і яго размеры і прыняць канчатковае рашэнне.

8. Устанавіць, што прадпрыемствы, установы і арганізацыі, якія маюць у карыстанні зямельныя ўчасткі, прадастаўленыя ім да ўвядзення ў дзеянне Кодэкса Беларускай ССР аб зямлі, абавязаны да 1 студзеня 1994 года аформіць дакументы, якія сведчаць аб праве на валоданне або аб праве на пастаяннае карыстанне зямлёй. Пасля заканчэння ўказанага тэрміну раней прадастаўленае ім права карыстання зямельнымі ўчасткамі прызнаецца страціўшым сілу.

9. Савету Міністраў Беларускай ССР забяспечыць:

выдзяленне адпаведных грашовых сродкаў і матэрыяльна-

тэхнічных рэсурсаў, неабходных для правядзення зямельнай рэформы;

аўтамабільным транспартам землеўпарадкавальныя службы Камітэта па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Беларускай ССР і інстытут «Белдзіпразем»;

падрыхтоўку ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах рэспублікі неабходнай колькасці спецыялістаў-землеўпарадчыкаў для ўкамплектавання такімі спецыялістамі землеўпарадкавальных і прыродаахоўных службаў.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

18 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 612—XII.

---

## ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 116 Аб частковым змяненні структуры Савета Міністраў Беларускай ССР*

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Унесці наступныя змяненні ў структуру Савета Міністраў Беларускай ССР, зацверджаную Вярхоўным Саветам Беларускай ССР 11 ліпеня 1990 года:

1. Пераўтварыць:

Міністэрства прамысловасці Беларускай ССР у рэспубліканскі Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па прамысловасці і міжгаліновых вытворчасцях;

Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па справах будаўніцтва ў саюзна-рэспубліканскі Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па архітэктуры і будаўніцтву;

Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па сельскай гаспадарцы і харчаванню ў рэспубліканскае Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларускай ССР.

2. Ліквідаваць Міністэрства лясной прамысловасці Беларускай ССР.

3. Увесці ў структуру Савета Міністраў Беларускай ССР пасаду Намесніка Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР,

---

* *Апублікавана ў газетах: «Звязда» — 1 сакавіка 1991 года, «Советская Белоруссия» — 2 сакавіка 1991 года, «Белорусская нива» — 5 сакавіка 1991 года.*

які ведае пытаннямі сельскай гаспадаркі і харчавання, выключыўшы пасаду Намесніка Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР, Старшыні Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па сельскай гаспадарцы і харчаванню.

4. Выключыць са структуры Савета Міністраў Беларускай ССР пасаду Міністра Беларускай ССР па сувязях з грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

20 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 618—XII.

---

ЗАКОН

БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

## 117 Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Беларускай ССР «Аб Савеце Міністраў Беларускай ССР»*

У сувязі з Пастановай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад 20 лютага 1991 года «Аб частковым змяненні структуры Савета Міністраў Беларускай ССР» Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Унесці ў Закон Беларускай ССР ад 20 чэрвеня 1979 года «Аб Савеце Міністраў Беларускай ССР» (ЗЗ БССР, 1979 г., № 18, арт. 296; 1990 г., № 21, арт. 370) наступныя змяненні і дапаўненні:

артыкул 25 пасля слоў «Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў Беларускай ССР» дапоўніць словамі «Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларускай ССР», выключыўшы з артыкула словы «Міністэрства лясной прамысловасці Беларускай ССР» і «Міністэрства прамысловасці Беларускай ССР»;

у артыкуле 26 словы «Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па справах будаўніцтва» замяніць словамі «Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па архітэктуры і будаўніцтву»;

артыкул 27 пасля слоў «Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР

---

* *Апублікаваны ў газетах: «Звязда» — 1 сакавіка 1991 года, «Советская Белоруссия» — 2 сакавіка 1991 года, «Белорусская нива» — 5 сакавіка 1991 года.*

па праблемах вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» дапоўніць словамі «Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па прамысловасці і міжгаліновых вытворчасцях», выключыўшы з артыкула словы «Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па сельскай гаспадарцы і харчаванню».

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

20 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 619—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 118 Аб вызваленні тав. Ціхіні В. Г. ад пасады Міністра юстыцыі Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Вызваліць тав. **Ціхіню** Валерыя Гур'евіча ад пасады Міністра юстыцыі Беларускай ССР у сувязі з пераходам на іншую работу.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

21 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 623—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 119 Аб назначэнні Міністра юстыцыі Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Назначыць Міністрам юстыцыі Беларускай ССР таварыша **Дашука** Леаніда Андрэевіча.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

21 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 624—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 120 Аб назначэнні Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Назначыць Міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання Беларускай ССР таварыша **Мірачыцкага** Фёдара Уладзіміравіча, вызваліўшы яго ад пасады Міністра Беларускай ССР.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

21 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 625—XII.

---

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## 121 Аб назначэнні Міністра будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

Назначыць Міністрам будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог Беларускай ССР таварыша **Яцуту** Станіслава Паўлавіча.

**Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.**

21 лютага 1991 года, гор. Мінск.
№ 626—XII.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА [illegible] САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ [illegible]

**120** Аб [illegible] гаспадаркі і харчовання Беларускай [illegible]

Прэзідыум [illegible] Савета Беларускай [illegible] Сацыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

[illegible] Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

[illegible]

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА [illegible] САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

**121** Аб вызваленні [illegible] міністра [illegible] і эксплуатацыі [illegible] Беларускай ССР

Прэзідыум [illegible] Савета Беларускай [illegible] Сацыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

[illegible] Беларускай ССР [illegible]

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

[illegible]

# ВЕДОМОСТИ

# ВЕРХОВНОГО СОВЕТА БЕЛОРУССКОЙ ССР


**5 апреля 1991 г.** **№ 10(12)** **Издаются с 1990 г.**


## СОДЕРЖАНИЕ


111. Закон Белорусской Советской Социалистической Республики о социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС.

112. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о порядке введения в действие Закона Белорусской ССР «О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС».

113. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о Комплексной целевой программе Белорусской ССР «Охрана материнства и детства в условиях воздействия последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС» на 1991—1995 годы.

114. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о передаче некоторых полномочий Верховного Совета Белорусской ССР в сфере регулирования земельных отношений Президиуму Верховного Совета Белорусской ССР.

115. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о проведении земельной реформы в республике.

116. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о частичном изменении структуры Совета Министров Белорусской ССР.

117. Закон Белорусской Советской Социалистической Республики о внесении изменений и дополнений в Закон Белорусской ССР «О Совете Министров Белорусской ССР».

118. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР об освобождении тов. Тихини В. Г. от должности Министра юстиции Белорусской ССР.

119. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о назначении Министра юстиции Белорусской ССР.

120. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о назначении Министра сельского хозяйства и продовольствия Белорусской ССР.

121. Постановление Верховного Совета Белорусской ССР о назначении Министра строительства и эксплуатации автомобильных дорог Белорусской ССР.

ЗАКОН
БЕЛОРУССКОЙ СОВЕТСКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ
РЕСПУБЛИКИ

# 111 О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС*

Авария, произошедшая 26 апреля 1986 года на Чернобыльской атомной электростанции, является самой крупной катастрофой современности. Она затронула судьбы миллионов людей, проживающих на огромных территориях. Создались новые экологические, социальные и экономические условия в регионах радиоактивного загрязнения.

Белоруссия объявлена зоной национального экологического бедствия. До сих пор не представляется возможным оценить весь объем и последствия чернобыльской катастрофы. Предотвращение неблагоприятной социальной и экологической ситуации в республике требует значительных усилий, вовлечения больших финансовых, материальных и научных ресурсов республики и страны.

## Раздел I
## ОБЩИЕ ПОЛОЖЕНИЯ

**Статья 1.** Настоящий Закон направлен на защиту прав и интересов граждан, принимавших участие в ликвидации последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС, отселенных и выехавших на новое место жительства с территории радиоактивного загрязнения, проживающих на указанной территории, и иных категорий граждан, определенных данным Законом.

**Статья 2.** Граждане, проживающие (работающие) на территории Белорусской ССР, имеют право на получение льгот и компенсаций за ущерб, причиненный их здоровью и имуществу в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС, в порядке и на условиях, установленных настоящим Законом и другими законодательными актами Белорусской ССР и Союза ССР.

**Статья 3.** Условия проживания и трудовой деятельности населения без ограничений по радиационному фактору на загрязненной радионуклидами территории определены союзной кон-

* *Опубликован в газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Белорусская нива» 13 марта 1991 года.*

